# ИСТОРИЯ

УДК 2 (091) (476)

## СТАНОВІШЧА УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ І СПРОБЫ ЯЕ РЭФАРМАВАННЯ Ў КАНЦЫ 20-30-х ГАДОЎ XIX СТ.

*Г.У. СЕРАДА*

*У артыкуле аналізуецца паступовая лацінізацыя уніяцкай царквы і яе агульнае становішча. Разглядаецца палітыка царскага ўрада ў дачыненні дауніятаў, спробы рэфармавання ў канцы 20 - 30-х гадоў XIX ст. і прычыны ліквідацыі уніі.*

Адной з галоўных прычын, якія прывялі уніяцкую царкву да ліквідацыі, была яе лацінізацыя. Лацінізацыі уніяцкай царквы спрыяла цесная сувязь уніяцкага духавенства з каталіцкім клірам, паступленне вялікай колькасці уніяцкіх святароў вікарыямі ў каталіцкія касцелы, навучанне відных дзеячоў уніяцкай царквы ў каталіцкіх навучальных установах, напрыклад у грэцкай калегіі Св. Афанасія ў Рыме, заснаванай папай Рыгорам XIII для атрымання вышэйшай багаслоўскай адукацыі уніяцкім клірам, у Віленскай, Пражскай, Брунсбергзскай папскіх семінарыях [1, с. 329].

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы глебы для лацінізацыі адыграў базіліянскі ордэн, які быў заснаваны ў 1617 г. [2, с. 280]. Ордэн павінен быў аб'яднаць усё уніяцкае манаства ў адзінае з'яднанае брацтва па вобразу і падабенству езуіцкага ордэна. Асаблівасцю базыліян было тое, што ў яго склад маглі ўваходзіць і каталікі. Ордэн быў вызвалены ад улады епархіальных архірэяў і падпарадкоўваўся толькі главе рымска-каталіцкай царквы, атрымліваючы ўсе распараджэнні ад папы праз асобага пракуратара ў Рыме. Такое становішча прадвызначала ролю базіліян унутры уніяцкай царквы. Аб прывілейным становішчы ордэна сведчаць наступныя факты: уніяцкія епіскапы маглі выбірацца толькі з ліку базіліян; епіскапы абавязваліся быць членамі ордэна і садзейнічаць яго мэтам у сваіх епархіях; базіліяне набылі амаль поўную сама-стойнасць у сваіх дзеяннях, а разам з гэтым і поўную перамогу над уніяцкімі мітрапалітамі згодна з прадпісаннем папы на кангрэгацыі ў Навагрудку ў 1686 г. [3, с. 10 - 15]. Паступова дзейнасць ордэна пранікла ва ўсе сферы царкоўнага кіравання. Такім чынам, базіліяне сталі не толькі магутнай сілай уніяцка-каталіцкай партыі ў барацьбе з праваслаўем, але з цягам часу яны ўсе больш спрыялі распаў-сюджванню уніі і яе набліжэнню да каталіцтва. К канцу жыцця уніяцкага мітрапаліта Іосіфа Руцкага амаль усе праваслаўныя манастыры апынуліся ў руках базіліян, у тым ліку і Віленскі манастыр Св. Троіцы. Рым пільна сачыў за дзейнасцю ордэна, надзяляючы яго тымі ж прывілеямі, што і езуітаў, а ў сваіх граматах папа называў яго не інакш як «славуты, цудоўны, надзвычайны, самы варты пераймання і пахвал» [4, с. 76].

Базіліяне шмат чаго змянілі ў абрадах грэка-уніяцкай царквы і ў адпраўленні літургіі ў бок каталіцтва. Да часу далучэння уніяцкая царква страціла нават тое, што, на думку саміх каталікоў, павінна было складаць яе карэннае адрозненне ад каталіцтва - усходнюю богаслужэбную абраднасць. Пачатак зменам абраднасці быў пакладзены ў 1720 г. на Замойскім саборы, пасля якога уніяцкая царква была канчаткова падпарадкавана ўладам Рыма з абавязацельствам распаўсюджваць і ўкараняць вучэнне ката-ліцкай царквы [5, с. 182]. Абраднасць уніяцкай царквы змянялася паступова, па меры таго як уніяцкае духавенства пранікалася рымска-каталіцкімі ідэямі і ўступіўшыя ва уніяцкі клір каталікі ўносілі рымскія царкоўныя абрады і звычаі. Вывучэнне царкоўна-славянскай мовы ў базіліянскіх школах паступова прыпынілася, і шмат уніяцкіх святароў пры выхадзе з семінарыі не ўмелі чытаць па-царкоўна-славянску і адпраўляць царкоўную службу. Святары знаходзілі выйсце ў тым, што вялі службу па сшытках, у якіх абедні і іншыя чынапаследванні былі напісаны польскімі літарамі, а пропаведзі ўсе часцей прамаўляліся не на «мясцовай гаворке», а на польскай мове [6, с. 26]. Нават полацкі кафедральны сабор у 1834 г. не быў выключэннем. Архіепіскап Смарагд (Крыжаноўскі) пісаў 5 сакавіка 1834 г.: «На літургіі па чытанню Евангелія, біскупы з іншым духавенствам выходзяць на сярэдзіну царквы, сядаюць на стулля і слухаюць доўгую польскую казань, якую напярэдадні падрыхтаваў і зараз кажа які-небудзь клірык-прафесар або ксёндз. Гэта абсалютныя каталікі-іншаземцы... Тым усё гэта дзіўна і нязгодна з патрэбамі, што уніяцкія прыхажане размаўляюць адной простай беларускай гаворкай, сіх польскіх казаней не разумеюць, бо ўсе уніяты складаюцца з сялян і самай бяднейшай шляхты, а таму каталікі наогул называюць уніяцкую веру мужыцкай» [6, с. 26].

Актыўная дзейнасць базіліян на ніве адукацыі прывяла уніяцкую царкву да павароту ад праваслаўнага Усходу да лацінскага Захаду. Унія не выканала сваю нацыянальную місію. У сваей аснове яна не мела строга ўсталяванага дагматычнага вучэння і кананічнага строю. Навязаная насельніцтву

Беларусі сілай унія не магла пусціць глыбокіх каранёў у духоўным жыцці народа і ператварылася, па сутнасці, у аб'ект лацінізатарскіх замыслаў Рыма. Лацінізатарская дзейнасць базіліян прадвызначала канфлікт паміж чорным і белым духавенствам, які прыняў пагражаючыя памеры на мяжы XVIII - XIX стст. [7, с. I - 7]. Падрыхтаваўшы глебу для лацінізацыі уніяцкай царквы, ордэн адначасова падрыхтаваў і глебу для яе ўнутранага крызісу.

Уніяцкія іерархі, нягледзячы на абяцанні папы, не былі ўраўнены ў правах з каталіцкай іерархіяй. Каталіцкае духавенства з пагардай адносілася да уніяцкага і выступала супраць любой спробы уніяцкага кліра наблізіцца па свайму становішчу да каталіцкага. Ставячыся з пагардай да уніяцкага духавенства, называючы яго «схізматычным», варожым Расейскай царкве, каталікі часта дазвалялі сабе непрыстойныя выхадкі нават супраць вышэйшых уніяцкіх іерархаў. Асабістую зайздрасць каталіцкага духавенства выклікала дзесяціна - галоўная аснова матэрыяльнага дабрабыту уніяцкага духавенства, якую яны атрымлівалі ад паствы. Такім чынам, губляючы свае праваслаўнае аблічча, уніяцкая царква так і не атрымала статуса, роўнага каталіцкай [5, с. 233].

Лацінізатарская дзейнасць базіліян не прыпынілася нават пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі. І. Семашка пісаў ва ўспамінах, што к 1828 г. «...усе памешчыкі і заможны клас народа перайшлі ўжо ў лацінства, а ў уніі засталіся толькі 1000000 беднага простага народа; гэты народ пастаўлены быў у залежнасць ад лацінян пры дапамозе памешчыкаў і рымскага духавенства; уніяты былі падначалены лацінянам з Рымскай калегіі; базіліяне ператварыліся амаль зусім у лацінян, складаючыся на 2/3 з асоб лацінскай веры» [8, с. 54]. Лацінізацыі уніяцкай царквы спрыяла таксама і палітыка расійскіх імператараў: даволі нейтральная ў адносінах да уніі палітыка Кацярыны II, Паўла I, і асабліва Аляксандра I, спрыяўшая прыпыненню далучэння уніятаў да праваслаўя і ўзмацненню каталіцтва. Базыліяне валодалі магутнымі эканамічнымі рэсурсамі, карысталіся падтрымкай папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі А. Чартарыйскага і паланізаванага дваранства на месцах. Таму іх лацінізатарская дзейнасць у пачатку XIX ст., па сутнасці, прывяла уніяцкую царкву да расколу на прыхільнікаў яе поўнага зліцця з каталіцызмам і збліжэння з праваслаўем [9, с. 55].

У першыя гады царавання Мікалая I уніяцкая царква складачася з чатырох епархій: Брэсцкай, на чале з брэсцкім епіскапам І. Булгакам; Віленскай, на чале якой стаяў віленскі епіскап А. Галаўня; Полацкай ці Беларускай, на чале з архіепіскапам І. Мартусевічам і Луцкай, з архіепіскапам І. Красоўскім [10, с. 3]. Кіраванне уніяцкімі справамі было засяроджана ў другім дэпартаменце рымска-каталіцкай калегіі, якая знаходзілася ў распараджэнні дэпартамента іншаземных веравызнанняў, пад галоўным кіраваннем міністра народнай асветы А.С. Шышкова. Дырэктарам дэпартамента з 1824 г. быў І.І. Картышэўскі. Старшыней рымска-каталіцкай калегіі быў мітрапаліт І. Булгак [10, с. 3].

У 1827 г. І. Сямашка падаў запіску, паслужыўшую зыходным момантам працэсу, які завяршыўся ўз'яднаннем уніяцтва з праваслаўем [11, с. 5]. І. Сямашка прапаноўваў здзейсніць шэраг мерапрыемстваў: замест уніяцкага дэпартамента заснаваць самастойную, незалежную ад каталіцкай, грэка-уніяцкую калегію; замест чатырох уніяцкіх епархій заснаваць дзве - Беларускую і Брэсцкую (Літоўскую); Полацкаму епіскапу даць вікарыя з тым, каб ен старшынстваваў у мясцовай кансісторыі; скасаваць кафедральныя капітулы і ўвесці саборнае духавенства; замест рымскіх дыстынкторый увесці наперстныя крыжы; палепшыць утрыманне і павялічыць правы кансісторый; павялічыць забеспячэнне Полацкай і Жыровіцкай семінарый; заснаваць пры семінарыях падрыхтоўчыя вучэльні; спыніць адпраўленне уніяцкіх выхаванцаў у рымска-каталіцкую семінарыю пры Віленскім універсітэце; перайменаваць Полацкую семінарыю ў акадэмію і інш. [8, с. 582].

22 красавіка 1828 г. была заснавана асобая уніяцкая калегія пад старшынствам мітрапаліта. Калегія складалася з епіскапа і архімандрыта па прызначэнню ўрада і чатырох протаірэяў па выбранню мясцовых архірэяў і кансісторый [12, с. 28 - 29]. У 1828 г. для адукацыі духоўнага грэка-уніяцкага юнацтва была заснавана грэка-уніяцкая духоўная семінарыя ў мястэчку Жыровічы. Забаранялася пасылаць выхаванцаў з уніяцкай семінарыі ў галоўную рымска-каталіцкую семінарыю, бо дзеля гэтага было вырашана заснаваць акадэмію ў Полацку. Але акадэмія не была адчынена. Узамен яе І. Сямашка рэкамендаваў пасылаць выхаванцаў уніяцкай семінарыі для атрымання вышэйшай багаслоўскай адукацыі ў праваслаўную акадэмію [12, с. 28 -29].

17 кастрычніка 1828 г. быў выдадзены загад аб парадку выбараў грэка-уніяцкіх духоўных кансісторый. У кансісторыю былі прыцягнуты базіліяне, а епіскап быў абавязаны выбіраць у члены тых настаяцелей, якія найбольш адрозніваліся адданасцю пастановам царквы і праваслаўнаму богаслужэнню. Гэты загад быў выкліканы жаданнем прыцягнуць базыліян да агульнага кантроля праз кансісторыю [13, с. 359]. У 1829 г. грэка-уніяцкая калегія забараніла епархіальным начальствам даваць дазвол сваім святарам на служэнне пры рымска-каталіцкіх цэрквах і капліцах. Па выніках праведзенай рэвізіі было скасавана больш за 60 базыліянскіх манастыроў [8, с. 56].

У 1929 г. І. Сямашка быў пасвечаны ў епіскапы. Ён атрымаў аблачэнне праваслаўнага епіскапа і быў назначаны старшынёй кансісторыі грэка-уніяцкай Беларускай епархіі з найменаваннем епіскапам Мсціслаўскім і з правам прысутнічаць у Калегіі ў Пецярбурзе.

Паўстанне 1831 г. шмат змяніла ў становішчы уніяцкай царквы. Удзел уніяцкіх святароў і базіліян у паўстанні прывеў да замены ўсіх епіскапаў у беларускіх і літоўскіх губернях. Святарскія месцы былі замешчаны выхадцамі з Украіны. Дзяцей беларускага духавенства пасылалі вучыцца ва ўнутраныя расійскія губерні ці на Украіну. Полацкая епархія разам са скасаванай Луцкай перайшлі пад кіраванне мітрапаліта І. Булгака, а Брэсцкая была ўз'яднана з Літоўскай і на чале яе быў пастаўлены епіскап І. Сямашка [9, с. 57 - 58].

11 красавіка 1833 г. была распачата ўрадавая мера з мэтай паставіць кандыдатаў уніяцкіх святароў у незалежнасць ад мясцовых памешчыкаў. Было вырашана, каб духоўных асоб ва уніяцкія прыходы прызначаць са згоды мясцовых генерал-губернатараў [12, с. 28 - 29]. Кцітарства памешчыкаў, якія ў асноўнай масе былі каталікамі, знішчалася. Такім чынам, памешчыкі мелі мізэрны ўплыў у справе прызначэння уніяцкіх святароў на прыходы.

30 красавіка 1833 г. ў межах Беларускай уніяцкай епархіі была створана Полацкая праваслаўная епархія, на чале якой быў пастаўлены Пецярбургскі вікарый, епіскап Рэвельскі Смарагд (Крыжаноўскі) [6, с. 103]. Смарагд вельмі энергічна прыняўся за справу ўз'яднання уніятаў. Сваімі метадамі ён выклікаў абурэнне і незадаволенасць у епархіі, таму што не ведаў ні духа, ні асаблівасцей беларускіх уніятаў. Смарагд вырашыў, што ў розных месцах вялікай епархіі, вельмі па-рознаму настроеных да праваслаўя, ўз'яднанне ўсіх уніятаў можа здзейсніцца лёгка і проста, трэба толькі дзеля гэтага прыступіць да рашучых дзеянняў і не губляць часу. І. Сямашка адзначыў паспешнасць у дзеяннях праваслаўнага архіепіскапа Смарагда і прапанаваў распрацаваць сістэму мер для паступовага далучэння уніятаў [9, с. 57]. У адказ на гэтую прапанову з'явіўся Найвышэйшы ўказ ад 13 студзеня 1834 г. і сакрэтныя інструкцыі, якія прадпісвалі уніяцкім епіскапам асцярожна і паступова ачышчаць уніяцкую царкву ад каталіцкіх абрадаў. Уніяцкаму духавенству забаранялася адпраўляць богаслужэнні ў каталіцкіх касцёлах і ўдзельнічаць у царкоўных працэсіях каталікоў [9, с. 57]. У 1834 г. было прынята рашэнне: замест друкавання асобага служэбніка для уніяцкай царквы карыстацца служэбнікамі і кнігамі малебных пеній, надрукаваных у Маскоўскай сінадальнай друкарні; заняцца ўладкаваннем іканастасаў, начыння і свяшчэннага аблачэння для правільнага адпраўлення богаслужэння, на што кожнай епархіі адпускалася па 5000 рублёў [12, с. 30].

26 мая 1835 г. па найвышэйшаму загаду з духоўных і свецкіх саноўнікаў быў створаны асобны сакрэтны камітэт па уніяцкіх справах, які праектаваў далейшыя меры па пераўтварэнню уніяцкай царквы з канчатковай мэтай уз'яднання уніятаў [6, с. 174 - 175]. Полацкая і Жыровіцкая семінарыі, а таксама некалькі вучылішч, створаных пасля 1828 г., былі пераўтвораны па статутам, спецыяльна складзеным для грэка-уніяцкіх вучылішч [6, с. 175].

Зробленыя новаўвядзенні прывялі да таго, што галоўны аплот уніі - базіліянскі ордэн - быў паслаблены праз адабранне ў яго права пашырацца за кошт каталікоў і ўтрымліваць вучылішча для духавенства. Адукацыя уніяцкага духавенства была паднята і пастаўлена на адпаведную вышыню, прычым у праваслаўным духе. Уніяцкае богаслужэнне было ачышчына ад каталіцкіх абрадаў. Уніяцкае духавенства стала незалежным ад рымлян, перастала з імі змешвацца, што прывяло да росту праваслаўных настрояў уніяцкіх святароў [12, с. 17].

У пачатку 1838 г. памерлі уніяцкі мітрапаліт І. Булгак і Пінскі епіскап І. Жарскі - праціўнікі ўз'яднання уніятаў з праваслаўнымі. 2 сакавіка 1838 г. старшынёй грэка-уніяцкай калегіі быў прызначаны архіепіскап І. Сямашка. Епіскап В. Лужынскі і А. Зубко спачувалі ўз'яднанню абедзвюх цэркваў [8, с. 112]. Настрой духавенства ў гэты час быў даволі супярэчлівым. Гэтаму спрыяла галоўным чынам тая акалічнасць, што планы ўрада адносна уніі раскрыліся, уніяты зразумелі дзеля чаго вядзецца справа. Каталікі таксама адчувалі набліжаючуюся катастрофу і ўсімі сіламі стараліся схіліць уніятаў да каталіцтва [5, с. 217].

У Літоўскай і Полацкай епархіях далучэнне уніятаў ішло ў розных умовах. У Літоўскай епархіі імкненне да ўз'яднання было найбольш поўным. З 1057 яе святароў за аб'яднанне выказаліся 760 [9, с. 58]. У Полацкай епархіі ўз'яднанне сустрэла значную апазіцыю не толькі сярод духавенства, але і сярод міран. Тут з 680 святароў згоду далі толькі 186 [9, с. 58]. Магчыма, антыправаслаўныя настроі ў Беларускай епархіі былі выкліканы шэрагам прычын: Полацкая зямля была прыстанішчам для уніяцкіх святароў, якія не жадалі разам са сваімі прыходамі прыняць праваслаўе ў Валыні і Падоллі, у Мінскай і Кіеўскай губернях і ў іншых месцах. Таму ў Полацкай епархіі мацнелі рады фанатычна настроенага уніяцкага духавенства [6, с. 4].

Лаціна-польская партыя ў Беларускай епархіі ўяўляла вялікую і небяспечную для праваслаўя сілу, асабліва ў Дрысенскім, Лепельскім, Дзісненскім, Полацкім, Аршанскім, Люцынскім, Сененскім, Дынабургскім і Вэжыцкім паветах. Шмат маёнткаў належала каталікам, якія трымалі ў сваіх руках усё праваслаўнае і уніяцкае насельніцтва, бо ад іх залежала матэрыяльнае становішча духавенства і цэркваў, а да 1833 г. (адмена кціітарства) - і сам выбар святароў [6, с. 6].

Грамадзянскае насельніцтва, пачынаючы ад прадвадзіцеля дваранства і заканчваючы дробнымі чынамі земскай паліцыі, амаль усе былі каталікамі. Праваслаўнымі былі 1/6 частка чыноўнікаў [6, с. 6]. Пад уплывам прыналежнасці вышэйшых саслоўяў да каталіцкай царквы і польскай нацыі ў розуме насельніцтва Полацкай епархіі зарадзілася і мацнела думка, што палякі - вышэйшая нацыя, а унія і праваслаўе - «hlopska wiara». У 1833 г. Віцебскі грамадзянскі губернатар Шродар пісаў: «Грэка-уніяцкае веравызнанне ў адносінах да рымска-каталіцкага ў такім знаходзіцца падпарадкаванні, што ўсялякі шляхціц, пажадаўшы ўдзельнічаць на выбарах дваранскіх, ці каму пашанцавала нажыць па камерцыі капітал, непрыстойным лічаць заставацца ў уніі, а таму пераходзяць у каталікі, нават дзеці уніяцкіх святароў астаўляюць сваё веравызнанне з карысці, будучы бацькамі да таго яшчэ заахвочанымі...» [6, с. 8].

У Беларускай епархіі былі вядомы выпадкі сутыкненняў паміж уніяцкім і праваслаўным духавенствам. Напрыклад, у мястэчках Нішчы і Томсіна, дзе мясцовыя святары былі супраць распараджэння праваслаўнага епіскапа І. Нікольскага, прызначанага ў Полацкую праваслаўную епархію замест архіепіскапа Смарагда, і уніяцкага архіепіскапа В. Лужынскага аб тым, каб уніяцкія і праваслаўныя святары ў святочныя дні сустракаліся ў цэрквах для сумеснай службы, і таму зрабілі ўсе магчымае, каб не пусціць праваслаўных святароў у свае цэрквы. Таксама трэба адзначыць здарэнне, якое адбылося 16 верасня 1838 г. у с. Царкоўна Дрысненскага павета і вядомае як справа «111 святароў» [14, с. 81 - 82]. У гэтым мястэчку адбыўся сход уніяцкага духавенства і народа, на якім святары браты Ігнатовічы і Г. Касецкі звярнуліся з прапановай, у якой заклікалі сялян трымацца уніяцкай веры. Потым было падрыхтавана прашэнне да цара, падпісанае 111 святарамі. Яны прасілі, каб іх пазбавілі цяперашняга духоўнага кіраўніцтва, дазволілі адчыніць друкарню і перайсці ў каталіцтва ў выпадку, калі унія ўсе ж будзе скасавана. Следства па гэтай справе праводзіў полацкі ваенна-палявы начальнік падпалкоўнік Агатонаў. У адносінах да апазіцыйнага духавенства быў прыняты шэраг адміністрацыйных мер: уніяцкія святары пераводзіліся з адной епархіі ў другую, пазбаўляліся прыходаў, высылаліся ў манастыры ўнутраных губерній Расійскай дзяржавы [9, с. 479].

Урад убачыў, што зацягванне ў вырашэнні уніяцкага пытання дае магчымасць праціўнікам уз'яднання прымаць меры супрацьдзеяння. 22 і 26 снежня 1838 г. адбыліся пасяджэнні сакрэтнага камітэта, на якіх прысутнічалі: шэф жандармаў генерал А.Х. Бекендорф, міністр дзяржаўных маёмасцяў граф П.Д. Кісялёў, міністр унутраных спраў Д.Н. Блудаў, обер-пракурор Св. Сінода М.А. Пратасаў [9, с. 479]. Камітэт зацвердзіў наступныя прапановы: грэка-уніяцкія епіскапы са старшым духавенствам складуць царкоўны саборны акт, у якім прызнаюць адзінства з усходняй праваслаўнай царквой; гэты акт будзе падпісаны ўсімі, хто прысутнічаў пры яго складанні, а астатнія дадуць сваю пісьмовую згоду; акт і водгукі будуць накіраваны імператару разам з прашэннем, і ў той жа час будзе выдадзены найвысачайшы ўказ аб падпарадкаванні грэка-уніяцкай калегіі не Сенату, а Св. Сіноду; увесці войскі ў заходнія губерні для таго, каб пазбегнуць хваляванняў у тых уездах, дзе была моцная апазіцыя ўз'яднанню уніятаў з праваслаўнымі і інш. [9, с. 479].

Для высвятлення становішча ва уніяцкіх епархіях і паскарэння ўз'яднання 13 студзеня 1939 г. на Беларусь прыбыў прадстаўнік обер-пракурора Св. Сінода камергер В. Скрыпіцын. Разам з епіскапам 1. Сямашкай ім удалося дамагчыся згоды большасці уніяцкага духавенства на ўз'яднанне з праваслаўем [9, с. 59].

12 лютага 1839 г. у Полацку епіскапамі і вышэйшым духавенствам быў падпісаны «Саборны акт» аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай і напісана прашэнне на найвышэйшае імя [15, с. 204 - 207]. 26 лютага І. Сямашка перадаў яго обер-пракурору Св. Сінода графу Н.Д. Пратасаву. 1 сакавіка акт паднеслі на разгляд імператару. Да прашэння быў далучаны спіс 1305 святароў, якія выказаліся за далучэнне. Мікалай І даручыў Св. Сіноду абмеркаваць гэтыя дакументы і 25 сакавіка зацвердзіў «сннодальное деяние», змяшчаўшае пастанову аб уз'яднанні грэка-уніяцкай царквы з праваслаўнай. Грэка-уніятам былі пакінуты тыя абрады і звычаі, якія не супярэчылі сутнасці праваслаўя. Усяго ў 1839 г. ўз'ядналася каля 1607 прыходаў і больш за 1600 тыс. чалавек [9, с. 59]. Аднак ў 1839 г. унія не была ліквідавана ў Холмскай епархіі (Сідлецкая, Люблінская і Сувалкаўская губерні). Уз'яднанне на гэтай тэрыторыі адбылося толькі ў 1875 г. [5, с. 220].

У гістарыяграфіі скасаванне уніі ў 1839 г. разглядаецца як вынік дзейнасці імператара Мікалая 1, «рэакцыйнай палітыкі мікалаеўскай Расіі» ці вынік «здрады вышэйшага духавенства», «дзеянняў асобных іерархаў уніяцкай царквы, якія перайшлі на службу да расійскага ўраду». Але гэта была падзея, выкліканая гістарычнай неабходнасцю. Уніяцкая царква па сваёй сутнасці не магла заставацца самастойнай у агульнай гісторыі хрысціянскай царквы, бо створана яна была гвалтоўна, была падпарадкавана папе, а Рым глядзеў на яе, як на сродак перавода уніятаў у каталіцызм. Менавіта лацінізацыя уніяцкай царквы ў XVIII - першай трэці XIX ст. прывяла яе да расколу паміж былым духавенствам і манахамі базіліянскага ордэна. Рэфармаванне праваслаўнай царквы і змена яе дзяржаўнага статуса на фоне росту аўтарытэта праваслаўнай Расіі на праваслаўным Усходзе і яе ўнутрыпалітычных пошукаў дзяржаўнай ідэалогіі, якая б магла згуртаваць вакол сябе грамадства на духоўных каштоўнасцях праваслаўя, цяжкае матэрыяльнае стано-

вішча уніяцкага духавенства не маглі не аказаць уплыў на уніяцкіх іерархаў і не пераканаць іх у бессэнсоўнасці існавання кананічна не самастойнай царквы. Існаванне уніяцкай царквы, лацінізаванай, з імкненнем каталіцкай царквы падпарадкаваць яе свайму ўплыву, пры пануючым праваслаўным веравызнанні, з вялікадзяржаўнымі ідэямі, было нядоўгавечным, і яе лес быў прадвырашаны. Ён знайшоў свой выраз у Полацкім царкоўным саборы 1839 г.

## ЛІТАРАТУРА

1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. - Вильно, 1900. Т. 12.
2. Кірэеў В.Р. Базыліяне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Мн.: БелЭн, 1993. Т. 1. - 494 с.
3. Петров Н.И. Очерк истории базилианского ордена. - Киев, 1770.
4. Теплова В.А. Влияние латинизации унии на воссоединение униатов в 1839 г. // Материалы научно-богословской конф. - Мн., 1997. - 120 с.
5. Зноско К. Исторический очерк церковной унии. - М., 1993. - 233 с.
6. Шавельский Г. Последнее воссоединение с православной церковью униатов Белорусской епархии 1833 - 1839 гг. - СПб., 1910.
7. Ратч В. Уния после падения Польши. - Вильно, 1869.
8. Семашко И. Записки Иосифа Семашко, митрополита Литовского: В 3 т. - СПб., 1883. Т. 1.
9. Уния в документах: Сб.; Сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. - Мн.: Лучи Софии, 1997. - 520 с.
10. Чистович И. Пятидесятилетие (1839 - 1889) воссоединения с православной церковью западно-русских униатов. - СПб., 1889.
11. Попов А.Н. Несколько документов, относящихся к началу воссоединения униатов. - СПб., 1869.
12. Юрашкевич А. Общий взгляд на западнорусскую церковь до и во время воссоединения униатов с православной церковью в 1839 г. - СПб., 1889.
13. Бобровский П.О. Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I. - СПб., 1890.
14. Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця. - Мн., 1925.
15. Витебская старина. - Витебск, 1883. Т. 1.